УДК 94(476)+94(470+571)«1844/1857»

# РЭАЛІЗАЦЫЯ ІНВЕНТАРНАЙ РЭФОРМЫ ПАМЕШЧЫЦКАЙ ВЁСКІ Ў ВІЦЕБСКАЙ І МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНЯХ

***У. Р. РЭУТ*** [1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт, пр. Партызанскі, 26/2, 220070, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Вызначаецца парадак рэалізацыі інвентарнай рэформы ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, акрэсліваюцца адносіны прадстаўнікоў урада, памешчыкаў і прыгонных сялян да ўсталявання інвентарнага парадку. Ажыццяўляецца гісторыка-генетычны і кампаратыўны аналіз раней невядомых дакументальных крыніц з канцылярыі віцебскага генерал-губернатара, Галоўнага камітэта па сялянскай справе і Дэпартамента законаў Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі. Абгрунтавана выснова аб тым, што насуперак меркаванай аднастайнасці ў рэалізацыі інвентарнай рэформы ва ўсіх рэгіёнах у беларускіх губернях яна праводзілася са шматлікімі адступленнямі ад першапачатковых правіл. Неабходнасць згуртавання дваранства вакол цэнтральнай улады ў час Крымскай вайны, а таксама наяўнасць істотных гаспадарчых асаблівасцей у памешчыцкай вёсцы ўсходняй Беларусі выклікалі неабходнасць замены інвентарных правіл ад 22 снежня 1852 г., складзеных паводле ўзору правіл для Правабярэжнай Украіны, на іх новы варыянт, распрацаваны адмыслова для Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Паказана, што вынясенне карэктных ацэнак вынікам інвентарнай рэформы патрабуе абавязковага звароту да рэгіянальнага кантэксту яе рэалізацыі.

***Ключавыя словы:*** інвентарная рэформа; Віцебская губерня; Магілёўская губерня; феадальныя павіннасці; Мікалай I; Аляксандр II.

# РЕАЛИЗАЦИЯ ИНВЕНТАРНОЙ РЕФОРМЫ ПОМЕЩИЧЬЕЙ ДЕРЕВНИ В ВИТЕБСКОЙ И МОГИЛЁВСКОЙ ГУБЕРНИЯХ

***В. Г. РЕУТ*** [1)]

[1)]*Белорусский государственный экономический университет,*
*пр. Партизанский, 26/2, 220070, г. Минск, Республика Беларусь*

Определяется порядок реализации инвентарной реформы в Витебской и Могилёвской губерниях, очерчивается отношение представителей правительства, помещиков и крепостных крестьян к установленному инвентарному порядку. Осуществляется историко-генетический и компаративный анализ ранее неизвестных документальных источников из канцелярии витебского генерал-губернатора, Главного комитета по крестьянскому делу и Департамента законов Государственного совета Российской империи. Обоснован вывод о том, что вопреки предполагаемому единообразию в реализации инвентарной реформы во всех

**Образец цитирования:**
Рэут У. Р. Рэалізацыя інвентарнай рэформы памешчыцкай вёскі ў Віцебскай і Магілёўскай губернях // Весн. БДУ. Сер. 3, Гісторыя. Эканоміка. Права. 2016. № 2. С. 47–51.

**For citation:**
Reut U. R. Implementation of inventory reform in the landlord village Vitebsk and Mogilev provinces. *Vesnik BDU. Ser. 3, Gistoryja. Jekanomika. Prava.* 2016. No. 2. P. 47–51 (in Belarus.).

**Автор:**
***Владислав Григорьевич Реут*** – заместитель декана факультета довузовской подготовки.

**Author:**
***Uladzislau Reut***, deputy dean of the faculty of pre-university training.
*reuth@tut.by*

регионах в белорусских губерниях она проводилась с многочисленными отступлениями от первоначальных планов. Необходимость сплочения дворянства вокруг центральной власти во время Крымской войны, а также наличие существенных хозяйственных отличий в помещичьей деревне восточной Беларуси вызвали необходимость замены инвентарных правил от 22 декабря 1852 г., составленных по образцу правил для Правобережной Украины, на их новый вариант, разработанный специально для Витебской и Могилёвской губерний. Показано, что вынесение корректных оценок результатам инвентарной реформы требует обязательного обращения к региональному контексту ее реализации.

***Ключевые слова:*** инвентарная реформа; Витебская губерния; Могилёвская губерния; феодальные повинности; Николай I; Александр II.

# IMPLEMENTATION OF INVENTORY REFORM IN THE LANDLORD VILLAGE VITEBSK AND MOGILEV PROVINCES

***U. R. REUT*** [a]

[a]*Belarusian State Economical University, Partizanskii avenue, 26/2, 220070, Minsk, Republic of Belarus*

The object of the article is to determine implementation order of the inventory reform in Vitebsk and Mogilev Governorates and to assess the attitude of government representatives, landlords and serfs to it. Historical genetic and comparative analysis implemented of previously unknown documentary sources from the office of Vitebsk Governorate General, the Main Committee on Peasant Affairs and the Department of the laws of the State Council. It was proved that the inventory reform was carried out with numerous deviations from initial plans despite supposed uniformity of its implementation in all west governorates. Necessity of rallying of landlords around the government during the Crimean War and significant economic differences of landlords' villages in East Belarus were reasons for changing inventory rules dated December 22, 1852, that were drafted according to the rules used for Right-bank Ukraine, into new rules specifically developed for Vitebsk and Mogilev Governorates. It was shown that it is necessary to refer to regional context of carrying out of the inventory reform for making adequate evaluative judgments about consequences of the reform.

***Key words:*** inventory reform; Vitebsk province; Mogilev province; feudal obligations; Nicholay I; Alexander II.

Рэалізацыя інвентарнай рэформы ва ўсходніх рэгіёнах Беларусі з'яўляецца адной з найменш даследаваных тэм у айчыннай гістарыяграфіі. Яна пачала распрацоўвацца ў 1950-я гг., аднак з прычыны сваёй складанасці істотнага развіцця не атрымала. З таго часу з'явіліся толькі дзве навуковыя публікацыі, у якіх аўтары аналізавалі механізм увядзення абавязковых інвентароў у Віцебскай і Магілёўскай губернях.

У 1954 г. выйшаў артыкул А. Т. Караткевіча і М. Р. Лысенкі «Інвентарнае пытанне ва ўсходняй Беларусі ў перыяд крызісу прыгонніцтва», дзе ўпершыню ўздымалася праблема ўздзеяння рэгіянальных гаспадарчых асаблівасцей на характар рэформы [1, с. 50–53]. Колькасць уведзеных інвентароў і парадак іх рэалізацыі ў артыкуле не акрэсліваліся. Не атрымалі належнага разгляду і заканадаўчыя дакументы, на падставе якіх складаліся інвентарныя апісанні. Асноўная ўвага навукоўцаў была звернута на раскрыццё незадаволенасці прыгонных інвентарамі і апісанне выпадкаў сялянскіх хваляванняў.

Неабходна адзначыць, што сучасныя гісторыкі нярэдка запазычваюць з даследавання А. Т. Караткевіча і М. Р. Лысенкі памылковую заўвагу аб «Правілах для складання інвентароў або вотчынных вопісаў у тых памешчыцкіх маёнтках Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе існуе цяглавая сістэма гаспадаркі», зацверджаных 14 мая 1855 г. (далей – «Правілы» 14 мая 1855 г.). У прыватнасці, у адным з выданняў адзначаецца: «…правілы тычыліся толькі цяглавых маёнткаў і не пашыраліся на маёнткі з *абшчыннай* (вылучана намі. – *У. Р.*) сістэмай землекарыстання»[1] [2, с. 340–341]. Насамрэч у тэксце інвентарных правіл змяшчалася іншая фармулёўка: «Правіл не распаўсюджваць да выдання адмысловых пастаноў на тыя памешчыцкія маёнткі Рэжыцкага, Люцынскага, Дзінабургскага і іншых паветаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў, дзе замест цяглавай існуюць *падворная* ці *іншая* сістэмы» [3, арк. 1]. Пад «іншай» разумелася ўчастковая сістэма, гэта значыць мадэрнізаваная форма палавіншчыны, дастаткова пашыраная ў інфлянцкіх паветах [4, л. 2–4].

У 1959 г. быў апублікаваны артыкул М. М. Улашчыка «Увядзенне абавязковых інвентароў у Беларусі і Літве». Даследчык дакладна акрэсліў сутнасць рэформы як ператварэнне інвентароў з прыватных і неабавязковых дакументаў у дзяржаўныя нарматыўныя акты [5, с. 264]. Пры гэтым артыкул быў амаль цалкам прысвечаны Віленскаму генерал-губернатарству. Даследчык толькі лаканічна адзначаў, што звесткі аб ходзе інвентарнай справы ў Віцебскай і Магілёўскай губернях вельмі супярэчлівыя, і прыводзіў некалькі адрозных пазіцый савецкіх гісторыкаў [5, с. 275]. Асабістае стаўленне да праблемы М. М. Улашчык прама не раскрыў, але з кантэксту працы вынікае, што ён схіляўся да меркавання, згодна з якім інвентары былі ўведзены ў нязначнай частцы маёнткаў усходніх беларускіх губерняў.

[1] Тут і далей пераклад наш. – *У. Р.*

Мэтай нашага артыкула з’яўляецца вызначэнне парадку рэалізацыі інвентарнай рэформы ў Віцебскай і Магілёўскай губернях, а таксама акрэсленне адносін да яе прадстаўнікоў урада, памешчыкаў і прыгонных сялян. Праведзенае даследаванне падпарадкавана прынцыпам гістарызму і аб’ектыўнасці. Уводзячы ў навуковы зварот шэраг невядомых раней дакументальных крыніц з канцылярыі віцебскага генерал-губернатара, Галоўнага камітэта па сялянскай справе і Дэпартамента законаў Дзяржаўнага савета Расійскай імперыі, мы імкнуліся разглядаць інвентарную рэформу як сістэму генетычна звязаных паміж сабой мерапрыемстваў, якія мелі ўплыў на далейшыя сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні, праведзеныя ўрадам Расійскай імперыі.

У 1846–1848 гг. у Віцебскай і Магілёўскай губернях тэрміны прадстаўлення памешчыкамі інвентароў пераносіліся 4 разы [6, арк. 109]. Калі ў Віленскай, Гродзенскай і Мінскай губернях марудная праца інвентарных камітэтаў тлумачылася, галоўным чынам, недастатковасцю матэрыяльна-тэхнічных рэсурсаў, то ў Віцебскай і Магілёўскай яна была абумоўлена значнымі гаспадарчымі перашкодамі. Палажэнне аб заснаванні камітэтаў для разгляду і складання інвентароў у заходніх губернях ад 15 красавіка 1844 г. (далей – Палажэнне 15 красавіка 1844 г.), згодна з якім павінны былі складацца абавязковыя інвентары, грунтавалася на пазямельным абкладанні павіннасцямі і не адпавядала мясцовым формам спагнання ўраўняльнай падушнай паншчыны [7, арк. 17].

У красавіку 1849 г. Часовы люстрацыйны камітэт Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі пастанавіў, што зацверджаныя губернскімі камітэтамі інвентары ў Віцебскай і Магілёўскай губернях не адпавядаюць пажаданням урада. Некаторыя інвентары ўтрымлівалі звесткі пра падворны падзел зямлі паміж сялянамі, астатнія – падзел на цяглы. Большасць гаспадарак пазначаліся ў інвентарах як шматцяглавыя. Пры гэтым фактычна памешчыкі захоўвалі ранейшую падушную паншчыну [8, арк. 32]. Агульная колькасць працоўных душ пры яе ўнясенні ў інвентары папросту дзялілася памешчыкамі на два. Ад кожнага фіктыўнага цягла, якое складалася з 2 працоўных душ, патрабавалася 6 працадзён прыгонаў і згонаў на тыдзень. Агульная вартасць павіннасцей штучна прыраўноўвалася да 1/3 часткі сялянскіх даходаў. Найбольш распаўсюджаным сродкам іх фальсіфікацыі з’яўлялася адлюстраванне завышанай ураджайнасці надзельнай зямлі.

Міністр унутраных спраў Л. А. Пяроўскі распарадзіўся пераслаць інвентары памешчыцкіх маёнткаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў у Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі, дзе яны без руху знаходзіліся 3 гады [8, арк. 489а]. Ацэначныя сцвярджэнні навукоўцаў аб тым, што абавязковыя інвентары палепшылі ці пагоршылі становішча прыгонных сялян у дачыненні да ўсходняй часткі Беларусі, патрэбна ўспрымаць з пэўнай доляй умоўнасці. Змяншэнне і павелічэнне павіннасцей фіксаваліся выключна ў тэкстах інвентарных апісанняў, аднак не мелі дачынення да гаспадарчых стасункаў паміж памешчыкамі і сялянамі. Выпадкаў увядзення інвентароў, складзеных на падставе Палажэння 15 красавіка 1844 г., у Віцебскай і Магілёўскай губернях не было.

У жніўні 1852 г. Міністэрства ўнутраных спраў Расійскай імперыі ўзначаліў Д. Г. Бібікаў. Галоўнай прычынай пераводу былога кіеўскага генерал-губернатара на вышэйшую пасаду стала яго рашучасць падчас правядзення інвентарнай рэформы ў Правабярэжнай Украіне [9, p. 695]. Мікалай I даручыў яму ўпарадкаванне інвентарнага заканадаўства ва ўсіх заходніх губернях. Па прапанове Д. Г. Бібікава 22 снежня 1852 г. імператар зацвердзіў для ўсіх беларускіх і літоўскіх губерняў агульныя інвентарныя правілы, амаль ідэнтычныя правілам для Правабярэжнай Украіны. Галоўным новаўвядзеннем гэтых правіл з’яўлялася абвяшчэнне сялянскіх надзелаў неадчужальнай зямлёй грамады. Прадугледжвалася замацаванне аб’ёму паншчыны на ўзроўні 3 дзён мужчынскай і 1 дня жаночай працы на тыдзень з цягла. Памешчыкам забаранялася раздрабняць цяглы, калі ў іх заставалася менш за 3 прыгонных працоўнага ўзросту [10, арк. 4, 13 зв.]. У рэаліях Віцебскай і Магілёўскай губерняў гэта азначала, што 4 штотыднёвыя працадні з цягла мусілі раскладацца не на 2, а на 3–4 работнікаў. Нягледзячы на тое што згоны і дадатковыя павіннасці захоўваліся ў ранейшым аб’ёме, фактычная феадальная рэнта скарачалася больш чым напалову. Інвентарныя правілы павінны былі абвяшчацца сялянам у царкве ў святочны дзень пасля літургіі. Апошнім тэрмінам для прывядзення інвентарных правіл у дзеянне прызначалася 10 мая 1854 г.

Большасць памешчыкаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў былі надзвычай незадаволены інвентарнымі правіламі, прынятымі 22 снежня 1852 г. Больш за ўсё землеўласнікаў непакоіла неабходнасць абвяшчэння неадчужальнасці сялянскіх надзелаў [11, л. 45]. Верагодна, у памешчыцкім асяродку гэта ўспрымалася як фактычная сацыялізацыя значнай часткі іх зямельных уладанняў. З іншага боку, у міністэрстве адзначалі, што ўзбуджанасць сялян чуткамі аб скарачэнні павіннасцей вымушала некаторых памешчыкаў Віцебскай і Магілёўскай губерняў «заўчасна задаволіць сваіх прыгонных, саступіўшы ім 1 дзень паншчыны ў тыдні» [4, л. 13]. Такім чынам, замест 3 каляндарных дзён – звычайна першых на тыдні – адпрацоўку паншчыны прызначалі толькі на 2 каляндарныя дні.

Ужо 2 красавіка 1854 г. пачаў працу сакрэтны камітэт для перагляду інвентарных правіл пад кіраўніцтвам цэсарэвіча Аляксандра. Знойдзены тэкст яго выступлення ў камітэце дазваляе вызначыць пазіцыю цэсарэвіча адносна інвентарнай рэформы: «Я ўпэўнены, што ўвогуле прыгоннае права на цяперашніх падставах не павінна застацца нязменным <…> я ўпэўнены таксама, што інвентары, прыстасаваныя справядліва да ўмоў сельскай гаспадаркі, могуць быць карыснымі ў гэтай важнай для Расіі справе, але пачаць пераварот падчас вайны было б згубным» [12, л. 48]. Звернем увагу, што інвентарная рэформа ў 1850-я гг. набыла выразную палітычную афарбоўку [13, л. 8 об.]. Адзін са стваральнікаў інвентарных правіл Д. Г. Бібікаў сцвярджаў, што расійскі ўрад не павінен падмануць чаканні прыгоннага сялянства заходніх губерняў, якое пад «бесчалавечным» кіраваннем палякаў «знясільваецца ў крывавай працы і абразах рознага кшталту» [12, л. 33].

Вырашальным фактарам, які прадвызначыў скасаванне інвентарных правіл, прынятых 22 снежня 1852 г., сталі цяжкае становішча Расійскай імперыі ў Крымскай вайне і неабходнасць згуртавання дваранства, у тым ліку і заходніх губерняў, вакол цэнтральнай улады, прадухіліўшы змовы і пашырэнне сепаратысцкіх настрояў. Цэсарэвіч Аляксандр меркаваў, што інвентарныя правілы з'яўляюцца разбуральнымі для ўладальнікаў, аднак, «нават калі б інвентары былі складзены найлепшым чынам, варта было б адкласці іх увядзенне да спакойных часоў» [4, л. 6].

Указам Мікалая I ад 15 красавіка 1854 г. увядзенне інвентарных правіл у беларускіх і літоўскіх губернях прызнавалася несвоечасовым. Да з'яўлення гэтага ўказа інвентарныя правілы былі абвешчаны сялянам у 11 маёнтках Віцебскай і 13 маёнтках Магілёўскай губерняў [4, л. 16]. Памешчыкі, якія паспелі ўвесці ў сваіх маёнтках інвентарныя правілы, адмаўляліся ад іх выкарыстання і патрабавалі ад сялян выканання павіннасцей у ранейшых памерах. Крыніцы паведамляюць пра адзіны выпадак, калі сяляне выказалі непаслушэнства. Выступленне адбылося ў Полацкім павеце ў маёнтку Лыскова памешчыка І. Ледаховіча. Ад працы адмовіліся 30 прыгонных, за што іх пакаралі розгамі [14, арк. 117]. Іншыя звесткі пра негатыўную рэакцыю сялян на адмену інвентарных правіл адсутнічаюць.

Вясной 1855 г. Дзяржаўны савет Расійскай імперыі ўхваліў, а 14 мая 1855 г. Аляксандр II зацвердзіў новыя інвентарныя правілы. Іх галоўнай асаблівасцю было вызначэнне ўсёй зямлі ў маёнтку неадчужальнай і поўнай уласнасцю памешчыка [15, арк. 5]. Цяглавым пачаў лічыцца надзел, прыдатны для земляробства, памерам ад 4,75 да 9,0 дзесяцін. Інвентарныя правілы зацвердзілі аднолькавую трохдзённую паншчыну для ўсіх сялян, якія карысталіся поўнымі цяглавымі надзеламі. Усе астатнія павіннасці адмяняліся, «якую б назву ні мелі» [15, арк. 14 зв.]. Пазаінвентарныя працадні тарыфікаваліся па цэнах наёмнай працы [16, л. 8]. Такім чынам, інвентарныя правілы пазбавілі памешчыкаў магчымасці неабмежавана выкарыстоўваць права згонаў ды патрабаваць ад сялян выканання іншай работы.

«Правілы» 14 мая 1855 г. прадугледжвалі складанне інвентароў па спрошчанай форме. У выглядзе табліцы прадстаўляліся пасямейныя спісы сялян, у якіх пазначаліся імёны ўсіх дарослых работнікаў, фіксавалася плошча сялянскіх надзелаў, а таксама колькасць цяглавай і свойскай жывёлы сялян [4, л. 3 об.]. Пазнейшыя ўстаўныя граматы, абумоўленыя рэформай 1861 г., мелі аналагічную структуру, з той розніцай, што калонка для пазначэння колькасці сялянскай жывёлы была заменена на калонку, дзе адлюстроўвалася выкупная сума за зямельны надзел.

У лістападзе 1855 г. Аляксандр II падпісаў пастанову Дзяржаўнага савета аб увядзенні з 1 студзеня 1856 г. новых правіл ва ўсіх маёнтках Віцебскай і Магілёўскай губерняў. Урачыстай цырымоніі для іх увядзення не было прадугледжана. Атрымаўшы інвентары, усе памешчыкі павінны былі неадкладна пачаць імі карыстацца. Павятовыя прадвадзіцелі дваранства абавязваліся сачыць за тым, каб у маёнтках, уладальнікі якіх пакуль не атрымалі інвентароў, выконваліся галоўныя патрабаванні інвентарных правіл: 1) сяляне з памерам паншчыны ў тры дні на тыдні вызваляліся ад усіх іншых павіннасцей; 2) фурманковая павіннасць выконвалася ў залік паншчыны; 3) дні паншчыны не пераносіліся на іншыя тыдні [4, л. 24].

Да лістапада 1857 г., калі прывядзенне інвентароў у адпаведнасць з «Правіламі» 14 мая 1855 г. спынілася, абавязковыя інвентары былі перададзены для карыстання прынамсі ў 741 маёнтак Віцебскай губерні (46,2 %) [17, арк. 57, 60; 18, арк. 7, 40–55; 19, арк. 23–30, 34–47, 51а; 20, арк. 16–40, 46–52; 21, арк. 53–102, 106–141а, 150–159, 173–210; 22, арк. 52–136; 23, арк. 55–96, 103–136]. Неабходна адзначыць, што ў архіўных крыніцах па Невельскім і Полацкім паветах інфармацыя ёсць не пра ўсе маёнткі.

Беларускі даследчык М. Ф. Шпакоў выявіў 1177 інвентароў памешчыцкіх маёнткаў Магілёўскай губерні (яны ахоплівалі 62,6 % маёнткаў губерні), складзеных напярэдадні адмены прыгоннага права [24, с. 562]. Вывучэнне структуры гэтых актаў дазваляе ідэнтыфікаваць іх як інвентары, перапрацаваныя паводле «Правіл» 14 мая 1855 г. Заўважым, што некалькі дзясяткаў перапрацаваных інвентароў маглі застацца ў канцылярыі інвентарнага камітэта неразасланымі. Распіскі памешчыкаў аб іх атрыманні адсутнічаюць.

Такім чынам, рэалізацыя інвентарнай рэформы ва ўсходняй Беларусі карэнным чынам адрознівалася ад паасобнага выпраўлення і ўвядзення абавязковых інвентароў у Віленскім генерал-губернатарстве. Змест «Правіл» 14 мая 1855 г. вылучаўся кансерватыўнасцю. Па сутнасці, яны з'яўляліся разгорнутай рэдакцыяй Маніфеста аб трохдзённай паншчыне 1797 г. Рэальныя нормы сялянскіх павіннасцей істотна не змяніліся, аднак гаспадарчыя адносіны паміж памешчыкамі і прыгоннымі былі фармалізаваны на падставе эканамічных рахункаў. Увядзенне «Правіл» 14 мая 1855 г. адпавядала парадку правядзення інвентарнай рэформы на Правабярэжнай Украіне, дзе ў 1847–1848 гг. з'явіліся агульныя інвентарныя правілы, а выпраўленне на іх падставе інвентароў маёнткаў расцягнулася на 3–4 гады.

Галоўным вынікам увядзення інвентарных правіл з 1 студзеня 1856 г. ва ўсходняй Беларусі стала юрыдычнае звядзенне прыгоннага права да пазямельнай залежнасці сялян ад землеўласнікаў. Дзяржаўная ўлада рыхтавалася ўзяць на сябе ролю пасрэдніка ў будучым вызваленні сялянства ад прыгону. Вышэйшыя чыноўнікі і дваране ўнутраных расійскіх губерняў былі заспакоены пацвярджэннем у інвентарных правілах для Віцебскай і Магілёўскай губерняў недатыкальнай уласнасці памешчыкаў на зямлю. Гэта стала своеасаблівым сігналам таго, што нават калі ўрад вызваліць прыгонных, то не распачне бязвыплатнае прымусовае адчужэнне памешчыцкіх угоддзяў. Да пазітыўных вынікаў рэалізацыі інвентарнай рэформы ва ўсходняй частцы Беларусі можна аднесці распрацоўку і ўвядзенне ў зварот узорнай формы дакументаў – інвентароў (прататыпы ўстаўных грамат), якія рэгулявалі адносіны паміж памешчыкамі і сялянамі.

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС (*REFERENCES*)


1. *Короткевич А. Т., Лысенко М. Г.* Инвентарный вопрос в восточной Белоруссии в период кризиса крепостничества // Учен. зап. Полоц. гос. пед. ин-та. 1958. Вып. 1. С. 45–63 [Korotkevich A. T., Lysenko M. G. Inventarnyi vopros v vostochnoi Belorussii v period krizisa krepostnichestva. *Uch. zap. Polotskogo pedagog. inst.* 1958. Vol. 1. P. 45–63 (in Russ.)].
2. Гісторыя сялянства Беларусі : у 3 т. / рэдкал.: Я. К. Анішчанка [і інш.]. Мінск, 1997. Т. 1 : Гісторыя сялянства Беларусі ад старажытнасці да 1861 г. / У. А. Сосна [і інш.].
3. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 153.
4. Рос. гос. ист. арх. Ф. 1149. Оп. 4. Д. 59.
5. *Улащик Н. Н.* Введение обязательных инвентарей в Белоруссии и Литве // Ежегодник по аграр. истории Вост. Европы. 1958 г. Таллин, 1959. С. 256–277 [Ulashchik N. N. Vvedenie obyazatel'nykh inventarei v Belorussii i Litve. *Ezhegod. po agrar. istorii Vost. Evr. 1958 g.* Tallinn, 1959. P. 256–277 (in Russ.)].
6. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 15769.
7. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 14746.
8. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 19770.
9. *Moon D.* The inventory reform and peasant unrest in right-bank Ukraine in 1847–48 // Slavonic East Eur. Rev. 2001. № 79 (4). P. 653–697 [Moon D. The inventory reform and peasant unrest in right-bank Ukraine in 1847–48. *Slavonic East Eur. Rev.* 2001. No. 79 (4). P. 653–697 (in Engl.)].
10. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 24176.
11. Рос. гос. ист. арх. Ф. 1290. Оп. 1. Д. 179.
12. Рос. гос. ист. арх. Ф. 1290. Оп. 1. Д. 206.
13. Рос. гос. ист. арх. Ф. 1180. Оп. 15. Д. 8.
14. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 1297. Воп. 1. Спр. 24173.
15. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 153.
16. Рос. гос. ист. арх. Ф. 1281. Оп. 6. Д. 71.
17. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 159.
18. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 160.
19. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 161.
20. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 162.
21. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 163.
22. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 164.
23. Нац. гіст. арх. Беларусі. Ф. 2635. Воп. 1. Спр. 165.
24. *Шпаков М. Ф.* Реализация реформы 1861 г. в Могилёвской губернии // Ежегодник по аграр. истории Вост. Европы. 1963 г. Вильнюс, 1964. С. 559–571 [Shpakov M. F. Realizatsiya reformy 1861 g. v Mogilevskoi gubernii. *Ezhegod. po agrar. istorii Vost. Evr. 1963 g.* Vilnius, 1964. P. 559–571 (in Russ.)].


*Артыкул паступіў у рэдкалегію 19.02.2016.*
*Received by editorial board 19.02.2016.*